# Што перашкаджае рабоце СНТ філфака

Набліжаецца агульнаўніверсітэцкі і гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ. У навукова-даследчых гуртках падводзяцца вынікі праробленай работы, паідзелавому абмяркоўваюцца даклады, прэтэндуючыя на права называцца лепшымі. У «Навуковых бюлетэнях» змяшчаюць рэцэнзіі на лепшыя работы студэнтаў. Ва усім адчуваецца адказнасць і напружанасць наступіўшага моманту.

Толькі на філалагічным факультэце маўчаць. Не сакрэт, што у гэтым навучальным годзе навукова-даследчая работа на факультэце заметна аслабла. Са ста сарака студэнтаў, якія заняты у гуртках, добрая палавіна выконвае ролю штатных слухачоў і то глядзячы па абставінах.

На факультэце позна прайшлі справаздачна-выбарчыя сходы. У той час, калі на іншых факультэтах адбылося па аднаму-два пасяджэнні, тут толькі пачыналася рэгістрацыя у гуртку. З васьмі гурткоў фактычна толькі два змаглі наладзіць работу—гурток беларускай літаратуры (кіраўнік т. Науменка) і гурток зарубежнай літаратуры (кіраўнік т. Фактаровіч).

Па ініцыятыве гуртка беларускай літаратуры праведзен дыспут па вершаванай хроніцы А. Куляшова «Грозная пушча». Студэнтам Г. Шупенька быў прачытан даклад «Эпічнае і драматычнае у аповесці Я. Коласа «Дрыгва». Пасняхова працуюць над узятымі тэмамі і некаторыя іншыя студэнты. Заняткі у гуртку праходзяць жыва і цікава. На абмеркаванне твораў запрашаюцца аўтары.

Гурток зарубежнай літаратуры арганізаваў літаратурны вечар, прысвечаны кнізе Іва Мантана «Солнцем полна голова». Акрамя гэтага зроблен агляд апошніх нумароў часопіса «Иностранная литература». Заслуханы чатыры даклады, тры з якіх будуць прадстаўлены на агляд. Слоў няма, прыемна адзначыць добрую работу. Але да якога часу будзе выязджаць СНТ філфака, як на любімым коніку, на гэтых двух гуртках?

Параўнаўча нядрэнна яшчэ працуе гурток дыялекталогіі (кіраўнік т. Мяцельская). Тут пішуцца даклады з непасрэдных назіранняў саміх студэнтаў над фанетычнымі і марфалагічнымі гаворкамі асобных вёсак раёнаў Беларусі. Абмеркавана ужо два даклады.

Не апраўдаў надзей у гэтым годзе гурток журналістыкі, якім кіруе т. Сніцэрава. Доўгі час ішлі тут спрэчкі аб тым, каму быць кіраўніком гуртка. Адных змянялі другія, але ад такіх перастановак справа не змянілася. А гурток журналістыкі мае перавагу перад іншымі у тых адносінах, што тут уздымаюцца актуальныя тэмы, прысвечаныя саракагоддзю Кастрычніка, якія без сумнення цікавяць студэнтаў. Да паслуг гуртка рукапісны часопіс «Творчасць журналіста», чарговага нумару якога даўно ужо чакаюць чытачы.

Аб навуковых гуртках пры кафедры рускай мовы і агульнага мовазнаўства (загадчык кафедры дацэнт Бірала) наогул няма чаго сказаць. Якую работу яны прарабілі у гэтым годзе? Ды амаль-што ніякай.

Некалькі слоў аб «Навуковым бюлетэні» (рэдактар т. Лойка). На факультэце з нецярплівасцю чакалі, калі выйдзе першы нумар, і ён з'явіўся! Роўна праз сем месяцаў! Ці то жыватворныя промні веснавога сонейка падсушылі бюлетэнь, ці ён і без таго быў сухім? (больш праўдападобна) Бюлетэнь давялося зняць. Чымжа вызначацца другія нумары бюлетэня?

Наспела неабходнасць у выпуску студэнцкіх навуковых работ. Трэба паклапаціцца аб тым, каб у гэты зборнік філфак мог прадставіць лепшыя работы гурткоўцаў. Пажадана таксама арганізаваць на факультэце творчы гурток, які-б меў свой альманах.

У падборы тэм трэба даваць права самастойнага выбару. Практыка паказала, што такія работы маюць значную навуковую каштоўнасць. Студэнтка Р. Усціменка, напрыклад напісала добрую работу па матэрыялах фальклора, сабраных на заводах Мінска. Студэнт Лапцёнак распрацаваў тэму «Камічнае у савецкай драматургіі».

З боку партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый будуць прымяняцца меры заахвочвання: публікацыя лепшых работ, аб'яўленне падзяк і узнагароджанне граматамі за добра напісаныя работы. Будуць выдавацца таксама грашовыя прэміі.

Не трэба прымушаць або ўпрошваць студэнта ў той ці іншы гурток. Не пераканаўчы скаргі некаторых студэнтаў на недахоп часу. Той, хто задумаў сур'ёзна аддацца навуцы, знойдзе і час для работы у навуковым гуртку.

**Член камсамольскага бюро філфака П. КАЗАЧОНАК.**





## У нашым скверы

Цудоўнае надвор'е устанавілася у апошнія дні. І ў гэтую добрую пару з раніцы да позняга вечара не змаўкаюць галасы у нашым універсітэцкім скверы. Гэта і зразумела. Журналісты, біёлагі, геолагі пасля здачы экзаменаў спяшаюцца сюды.

Вось выбеглі на алею будучыя настаўніцы, а сённяшнія студэнткі філалагічнага факультэта—толькі што прагучэў званок з лекцыі. (фото 1).



А вось гэта (фото 2) можна убачыць тут амаль заўсёды.

Зусім нядаўна сталі наведваць зялёны сквер студэнты, а ужо прымялі маладую траву, паламалі кусты. Паглядзіце на гэтых студэнтаў. Ім прыемна, а што застанецца пасля іх? І дзіўна, праходзяць дзесяткі студэнтаў, камсамольцаў і не звяртаюць увагі на такую агіднасць! (Фото 3).

Фото і тэкст П. БЕРАЖКОВА і М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

# ВЕРШЫ А. ХАРКЕВІЧА

*Займаючыся ва універсітэце, Аляксандр Харкевіч пісаў вершы аб студэнтах, аб любві і сяброўстве. Зараз ён працуе у Маладзечна, у рэдакцыі газеты, дзе таксама займаецца літаратурнай творчасцю. Свае новыя вершы Аляксандр даслаў у рэдакцыю нашай газеты. Ніжэй мы іх і змяшчаем.*

## ПЕРЕСТРАХОВЩИКАМ

До чего же славная погодка!
Новый год,
А на дворе—весна,
И, как говорят метеосводки,
Весь январь
Продержится она...
По душе мне этакая шалость
Без поры родившейся весны:
Молодая,
А не побоялась
Изменить порядок старины,—
Нарушая времени границы,
Утвердила бытие свое...
...Вот и вам бы
Каплю поучиться,
Слишком осторожным,—
У неё!

* * *

*Его я утречком увидел*
*На ветке липы,*
*У крыльца,*
*Нахохленного*
*(Знать, в обиде,*
*Что нет скворечницы)*
*Скворца.*
*И вспомнилось:*
*...Оставшись с братом*
*(Ушли на службу*
*Мать с отцом),*
*Мы смастерили*
*Для пернатых*
*Из старого комода*
*Дом.*
*Потом взнесли его на липу.*
*Ждали скворцов,*
*Развинув рот...*
*И здорово ж тогда нам всыпал*
*Отец*
*За сломанный комод!*
*То было в детстве.*
*Мы—в обиде—*
*Весь вечер дулись на отца.*
*Зато я утречком увидел*
*На липе первого скворца!*

## Если б ты только знала

*С бедой своей у вокзала*
*Брожу я*
*Наедине...*
*Если б ты только знала,*
*Как ты нравишься мне!*
*Если б ты только знала,*
*Если б могла понять,—*
*Ты бы пришла к вокзалу*
*Уехать мне*
*Помешать...*
*Ты бы пришла к вокзалу—*
*Иначе не может быть:*
*Сердце бы приказало*
*Тебе*
*Меня полюбить!*
*Сердце бы приказало*
*Другого—*
*Свести к нулю,*
*Если б ты только знала,*
*Как я тебя люблю...*

## КО МНЕ ПРИЕХАЛА МАМА...

**Ко мне приехала мама.**
**Узнать нетерпелось ей:**
**«Как-то устроился там он,**
**Сынок,**
**У чужих людей?**
**Не холодно ли в квартире?**
**Сыт ли?**
**Обут?**
**Одет?»**
**(Сынку-то—двадцать четыре,**
**А ей—под семьдесят лет!)**
**Устала она с дороги,**
**Едва жива**
**Доплелась:**
**В вагоне—не мало, не много—**
**Тысячу вёрст**
**Тряслась.**
**Досталось ей без сноровки:**
**«Уж эти мне поезда!»**
**А сын-то—в командировке,**
**Уехал...**
**«Вот ведь беда!**
**Дня три скучать, почитай-ка,**
**Одной**
**В четырех стенах...»**
**Глядит:**
**Под кроватью—майка,**
**А полотенце—страх!**
**Старуха тотчас за стирку,**
**Хлопочет изо дня в день—**
**То шьет, то штопает дырки**
**Сидеть ей без дела лень).**
**Кряхтит:**
**«Холостяк, известно!**
**Жениться б ему пора...**
**Соседка—ну, чем не невеста?**
**Сосватать бы—с плеч гора!**
**Жила б беззаботно, чинно...»**
**Старухе никак невдомек,**
**Что о другой дивчине**
**Давненько грустит сынок...**
**Уют, знакомый, тот самый,**
**Застав в квартире своей,**
**— Мама!**
**Приехала мама!—**
**Кричу от самых дверей.**

# „ДЫРЭКТАР" ШКОЛЫ

Каця прыкметна хвалявалася. Маладыя настаўніцы Светлана Трышына і Аня Цалко таксама адчувалі сябе не вельмі ўпэўнена



і час ад часу запытальна пазіралі на свайго «дырэктара». Для хвалявання былі усе падставы. Як ні як, а у гэты дзень ім прадстаяла упершыню пераступіць парог гэтай школы у ролі настаўнікаў.

А школа была сапраўды крыху незвычайнай. Замест вясёлай дзетвары за сталамі сядзелі маладыя рабочыя будаўнічага трэста № 136. Сабраліся тыя, хто марыць у гэтым годзе паступіць у ВНУ. Да іх і прыйшлі «дырэктар» школы—Каця Лешкова, студэнтка III курса гістарычнага факультэта і будучыя педагогі, студэнткі IV курса філфака Светлана і Аня. Ім прадстаяла першымі пачаць урокі з рабочымі, зрабіць пачатак іх падрыхтоўкі у ВНУ.

Невядома, каму раней прыйшла думка аб арганізацыі такой школы, але калі ў камітэце камсамола універсітэта загаварылі аб тым, што было-б нядрэнна і для студэнтаў і для рабочых арганізаваць з імі курс паўтарэння праграмы, неабходнай для паступлення ў ВНУ, Каця адразу-ж ухапілася за гэтую прапанову. Умелы камсамольскі арганізатар, яна з запалам узялася за работу. А работы было многа. Трэба было перш за усё пагутарыць з рабочымі, высветліць, хто з іх і куды марыць паступаць, скласці расклад заняткаў, падабраць з ліку студэнтаў выкладчыкаў і г. д.

Спачатку запісалася ў «школу» каля 40 рабочых-будаўнікоў. Каця падабрала на розных факультэтах выкладчыкаў. На філфаку акрамя Светланы і Ані ахвотна згадзіліся працаваць сяброўкі—трэцекурсніцы Іна Кананучанка і Ліда Ступакова, з фізіка-матэматычнага факультэта у «настаўнікі» пайшлі Нікалай Власавец, Андрыянчык і Белякоў; Тася Белаўшка і Рэня Зелянкоўская (студэнткі II курса гістфака) ўзяліся дапамагаць рабочым вывучаць нямецкую мову.

Так была арганізавана «школа», а Кацю ўсе «настаўнікі» аднадушна абралі «дырэктарам».

Малады «дырэктар» у сваю работу укладае усю душу. Не усё ладзіцца яшчэ ў школе. Будаўнікі іншы раз праяўляюць недысцыплінаванасць: без уважлівых прычын прапускаюць урокі. І таму Каці даводзіцца перажываць за паводзіны сваіх «вучняў». Тым не менш, работа ў «школе» ідзе поўным ходам.

Пажадаем-жа маладому «дырэктару» падрыхтаваць сваіх вучняў так, каб у гэтым годзе яны абавязкова паступілі ў БДУ.

**М. ВАЦІС.**

Уладзімір КАРЫЗНА

## ВЯСНОВЫ РАНАК

Вясновы ранак... Сонца зззяе...
Прапалі, зніклі халады,
Сняжок са стромых стрэх
сцякае
Шнуркамі тонкімі вады.

А з каміноў бесперапынна,
Як быццам з тоўстых папярос,
Адчальваюць хмурынкі дыма,
Паўзуць над кронамі бяроз.

Палі халат зімы зрываюць,
На свет ім хочацца зірнуць,
І лес шуміць, нібыта грае,
Вітае музыкай вясну.

...Мне люба гэткаю парою
Пад брылем даху пастаяць,
Струмень вады перад сабою
Далонню сціснутай збіраць!

АЛЬБЕРТ РАДЗІВІЛАЎ

## ДОРОГАЯ МОЯ, ХОРОШАЯ...

Дорогая моя, хорошая,
Не вернуть мне тебя никогда.
Так наивно и так непрошенно
Сердце рвалось к тебе тогда.

Слышу снова твой смех
серебристый
Вижу сини задумчивых глаз
Ты мне кажешься самою чистой
И красивой без всяких прикрас.

Только встретились мы и
расстались.
И такой нет, как ты, другой.
Ты по-прежнему в сердце осталась
Самой ласковой и дорогой.

